

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (662) | Аўторак, 6 кастрычніка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# СА СВЯТАМ!



*7-га кастрычніка—Дзень Канстытуцыі СССР*

## ВЯЛІКІЯ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

Дзесяць гадоў таму назад на нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання была прынята новая Канстытуцыя (Асноўны Закон) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У абмеркаванні яе праекта прынялі ўдзел звыш 140 млн. чалавек — больш чатырох пятых дарослага насельніцтва краіны. Прыняцце новай Канстытуцыі — гэта велізарная гістарычная падзея, якая адзначаецца як усенароднае свята савецкіх людзей, свята жыццесцвярджальнасці сацыялістычнай дэмакратыі.

«Пашыраючы дэмакратыю, умацоўваючы сацыялістычную законнасць, разгортваючы актыўнасць Саветаў народных дэпутатаў, прафсаюзаў, камсамола, іншых грамадскіх арганізацый, узвышаючы вартасці асобы, усямерна ахоўваючы правы грамадзян працоўных калектываў, мы адкрываем прастору самай магутнай стваральнай сіле сацыялізму — свабоднай працы свабоднага чалавека ў свабоднай краіне», — гаворыцца ў Звароце ЦК КПСС да савецкага народа, апублікаваным 14 сакавіка бягучага года.

Канстытуцыя СССР заканаўдаўча замацавала гістарычныя здзяйсненні Краіны Саветаў. Яна дала магутны імпульс далейшаму паглыбленню сацыялістычнай дэмакратыі, удасканаленню палітычнай арганізацыі савецкага грамадства, умацаванню прававой асновы дзяржаўнага і грамадскага жыцця, творчай актыўнасці савецкіх грамадзян. Асноўны Закон заклаў трывалы фундамент для разгортвання стваральнай дзейнасці ва ўсіх сферах нашага сацыялістычнага грамадства. У ім замацавана вядучая роля КПСС ва ўсіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях. Дзейнічаючы па-ленінску, выкарыстоўваючы закладзеныя ў нашым грамадстве і замацаваныя ў Канстытуцыі СССР перавагі сацыялістычнага ладу, партыя ўзяла курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і дасягненне на гэтай аснове новага стану грамадства.

Сёння мы жывём і працуем ва ўмовах усеагульнай перабудовы. У агульным русле дэмакратызацыі савецкага грамадства намечана змяніць парадак выбрання сакратароў райкомаў, гаркомаў, акружкомаў, абкомаў, крайкомаў партыі, сакратароў ЦК Кампартыі саюзных рэспублік. Прадугледжваецца ўвесці тайнае галасаванне на пленумах пры вылучэнні любой колькасці кандыдатур. У некаторых партыйных камітэтах пачалося апрабаванне новага механізма.

Стратэгія паскарэння патрабуе рэальнага абнаўлення зместу, форм і метадаў работы ўсёй сістэмы палітычных інстытутаў, далейшага разгортвання сацыялістычнага самакіравання. У развіцці паўнакроўнай дэмакратыі партыя бачыць і мэту, і галоўны рычаг рэвалюцыйнай перабудовы ўсіх бакоў нашай палітычнай, сацыяльнай, гаспадарчай практыкі і духоўнага жыцця.

Палітычную аснову СССР складаюць Саветы народных дэпутатаў. Яны найбольш поўна адлюстроўваюць дэмакратызм дзяржавы, яго самакіруючую сутнасць. Саветы — самыя масавыя органы народаўладдзя. У СССР налічваецца звыш 52 тысяч Саветаў народных дэпутатаў, у састаў якіх выбрана 2,3 млн. дэпутатаў. У мясцовыя органы Саветаў выбраны сёлета і прадстаўнікі нашага універсітэта: рэктар ГДУ, акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць — у абласны, прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў і студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта Н. І. Лапіцкая — у гарадскі, прарэктар па завочнаму навучанню дацэнт Л. Н. Сечка, студэнт эканамічнага факультэта Г. І. Маторанка і студэнт матэматычнага факультэта В. Д. Ляўчук — у раённы Саветы народных дэпутатаў. Усёй сваёй дзейнасцю яны імкнуцца з гонарам апраўдваць ускладзеныя на іх абавязкі.

У наша жыццё ўваходзіць ужо шмат новага. Парышэнне дэмакратыі — адметная рыса пераўтварэнняў у эканоміцы. Дэмакратыя выступае тут у новых яе формах: самакіраванні, выбарнасці гаспадарчых кіраўнікоў, рэальнай магчымасці працоўных уздзейнічаць на вырашэнне вытворчых і сацыяльных задач. Прыняцце Закона СССР аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні) стала буйнай палітычнай вяхой на шляху да народнага самакіравання. Цяпер прымаюцца ўсе меры, каб разняволіць энергію, павысіць самадзейнасць Саветаў. На гэта накіраваны і новыя рашэнні па далейшай дэмакратызацыі выбараў у Саветы народных дэпутатаў. Безадказна дзейнічаючай сістэмай становіцца галоснасць, таму што без яе не можа быць палітычнай творчасці народа, яго ўдзелу ў кіраванні.

Канстытуцыя СССР гарантуе для савецкіх людзей шырокія правы, разам з тым яна ўскладвае на іх вялікія абавязкі. Мы маем права на працу, вучобу, адпачынак, матэрыяльнае забеспячэнне сваёй старасці. Адначасова мы абавязаны не шкадаваць сваіх сіл і ведаў для плённай працы, каб наш заўтрашні дзень станавіўся яшчэ больш заможным, няўхільна ўзрастала эканамічная і абаронная магутнасць сацыялістычнай Айчыны.

Найпершы абавязак студэнтаў— настойліва авалодваць выбранымі спецыяльнасцямі, актыўна удзельнічаць у грамадскім жыцці. Гэтым яны павінны адказваць на тыя бацькоўскія клопаты, якія праяўляюць аб савецкім студэнцтве Камуністычная партыя і Савецкі ўрад. Як вядома, сёлета павышаны стыпендыі для тых студэнтаў, якія вучацца толькі на «выдатна» і «добра». Павялічыўся і размер імянных стыпендый. Прымаюцца мэтанакіраваныя меры для паляпшэння медыцынскага абслугоўвання будучых маладых спецыялістаў, лепшай арганізацыі іх адпачынку як у час вучобы, так і ў перыяд канікулаў.

Канстытуцыя СССР — на службе інтарэсаў кожнага савецкага грамадзяніна.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

За выдатныя поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці па хадайніцтву універсітэта Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР назначыла на першы семестр 1987—1988 навучальнага года

ЛЕНІНСКІЯ СТЫПЕНДЫІ:

Вользе ВАСЯЙЧАВАЙ, Алене ВОІНАВАЙ, Тамары МІХАЛКІНАЙ, студэнткам 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

Уладзіміру БУРАКОЎСКАМУ, студэнту 4-га курса матэматычнага факультэта, Кацярыне ПЕТРАКАВЕЦ, студэнтцы 3-га курса матфака.

Валерыю ЗЯЛЁНАМУ, студэнту 4-га курса фізічнага факультэта.

СТЫПЕНДЫЯ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ:

Алене ШЭВЕЛЕВАЙ, студэнтцы 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

## УДАСТОЕНЫ МЕДАЛЁЎ ВДНГ СССР

«Вынаходнікі і рацыяналізатары Дзяржагрпрома СССР» — такой тэме была прысвечана экспазіцыя работ наватараў на ВДНГ СССР у Маскве. Высокую ацэнку атрымала распрацоўка канструкцыі стэнда для выпрабавання тарцовых ушчыльненняў. Яе аўтары — старшы навуковы супрацоўнік праблемнай навукова-даследчай лабараторыі ГДУ У. А. Замятнін, малодшыя навуковыя супрацоўнікі гэтай жа лабараторыі А. Г. Лысееў, М. І. Сінюк і дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела І. М. Мельнічэнка ўдастоіліся бронзавых медалёў выстаўкі і грашовых прэмій.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства горача віншуюць асістэнтаў гэтай кафедры КЛІМКОВУ Людмілу Аляксандраўну і ЧАЙКУНА Паўла Міхайлавіча (навуковы кіраўнік — прафесар П. У. Сцяцко) з паспяховай абаронай дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

## ГРАМАТЫ ЗА СТАРАННАСЦЬ І АКТЫЎНАСЦЬ

Мінула працоўнае лета-87, аказана дапамога сельскім працаўнікам ва ўборцы вырашчанага ўраджаю. Зноў запаўняюць аўдыторыі юнакі і дзяўчаты. Студэнцкае жыццё выходзіць на новы круг — цяпер ужо вучэбны. А аб тым, што студэнты ГДУ прадэманстравалі сваю стараннасць у працы на будоўлях, прадпрыемствах, калгасных і саўгасных палетках вобласці, сведчаць шматлікія граматы, якія дасылаюць у камітэт камсамола універсітэта прымаўшыя студэнцкія атрады арганізацыі. Нямала грамат атрымалі атрады ГДУ і за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ў перыяд летняга працоўнага семестра, за добрыя вынікі ў занальных фестывалях СА.

8 граматамі ўзнагародзіў Рагачоўскі ГК ЛКСМБ атрад «Алеся» гісторыка-філалагічнага факультэта. Па вартасцях ацэнена праца і грамадская дзейнасць атрада «Асоль» эканомфака Рэчыцкім РК ЛКСМБ. Ганаровых грамат прымаючых гаспадарак — торфа-брыкетнага завода «Жыткавіцкі» і МПМК-94 — удастоены адпаведна СА «Юнацтва» з падрыхтоўчага аддзялення і будатрад «Градыент» матэматычнага факультэта. Партыйны камітэт, дырэкцыя, прафком і камітэт камсамола саўгаса «Бацвінава» Чачэрскага раёна ўзнагародзілі граматай студэнцкі сельскагаспадарчы атрад «Юнацтва» эканамічнага факультэта за высокую арганізацыю працы на ўборцы ўраджаю гародніны і актыўны ўдзел у палітыка-выхаваўчай рабоце сярод працаўнікоў саўгаса. За асаблівыя заслугі ў працы байцы атрада «Праметэй» з гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандр Казлоў і Мікалай Міхедаў атрымалі граматы Рагачоўскага гаркома камсамола.

(Наш кар.).

